# Воды якія яднаюць

**Пабрацімскія сувязі з гарадамі і рэгіёнамі іншых краін — адзін з прыярытэтных накірункаў развіцця Полацка. Адным з такіх гарадоў з'яўляецца Вісбю — цэнтральны горад шведскага вострава Готланд. Сяброўства гэта нарадзілася яшчэ ў 1999 годзе ў межах беларуска-шведска-латвійскага праекта «Панарама Дзвіна-Даўгава».**

Сёння гэты праект ужо завершаны, аднак ідзе падрыхтоўка да рэалізацыі новага, больш маштабнага, у якім мусяць прыняць удзел чатыры ці пяць краін. Яго мэтай будзе вызначэнне агульнага і адрознага ў культуры, побыце, традыцыях і звычаях народаў, якія возьмуць удзел у праекце.

Арганізатары — беларусы і шведы — актыўна распрацоўваюць яго, таму сёлета быў рэалізаваны падрыхтоўчы праект «Дзвіна-Даўгава: воды, якія яднаюць», падчас якога адпрацоўваецца методыка збору і аналізу інфармацыі, якая дазволіць вызначыць адказ на асноўнае пытанне: што паміж намі агульнага і ў чым мы адрозніваемся?

Летась арганізатары сустрэліся ў Рызе, каб распрацаваць метадалогію праекта. А ў гэтым годзе па традыцыі адбыўся абмен дэлегацыямі школьнікаў. У верасні пяць адзінаццацікласнікаў — навучэнцы Полацкай дзяржаўнай гімназіі №1 — пад кіраўніцтвам настаўнікаў англійскай мовы Наталлі Нялюбавай і Алёны Палій наведалі Вісбю. А напрыканцы кастрычніка наш горад вітаў шведскую дэлегацыю, у склад якой увайшлі чатыры гімназіста з г.Вісбю і арганізатараў — Ленарта Эдлунда і Свена Сандстрома, прадстаўнікоў Шведскага інстытута і муніцыпалітэта Вісбю.












Цікавай і насычанай была праграма знаходжання шведаў у Полацку. Пачалася яна з экскурсіі па Полацкай дзяржаўнай гімназіі №1 імя Францыска Скарыны. Пасля адбыўся сумесны ўрок англійскай мовы «Даведваемся адзін пра аднаго»: беларускія гімназісты рыхтавалі і прадстаўлялі мультымедыйную прэзентацыю пра Швецыю, а шведскія школьнікі ў такой жа форме распавядалі пра Беларусь.

«Нягледзячы на тое, што і палачане, і шведы вельмі хваляваліся — маляўніча і аб'ектыўна распавесці пра зусім незнаёмую культуру даволі складана, — гімназісты абедзьвух краін на выдатна справіліся з заданнем», — распавяла Наталля Нялюбава.

Гімназісты гарадоў-пабрацімаў згулялі ў баскетбол. Перамагла каманда гасцей, хаця і палачане амаль не адставалі! Пасля сустрэчы з адміністрацыяй ПДГ №1 полацкія школьнікі правялі для гасцей экскурсію па горадзе. Сустрэліся шведы і з начальнікам аддзела адукацыі, спорту і турызму Полацкага райвыканкама Ірынай Афанасьеўнай Драздовай, дзе дамовіліся супрацоўнічаць у будучым. Дэлегацыя таксама наведала Музей баявой славы.

Штовечар у беларускіх сем'ях, дзе пражывалі госці падчас знаходжання ў Полацку, праходзілі нефармальныя сустрэчы гімназістаў Полацка і Вісбю. Песні пад гітару, сумесныя вячэры — гэта дазволіла выдатна замацаваць тое сяброўства, якое нарадзілася у ходзе візіту шведскай дэлегацыі ў наш горад. Госці прызналіся, што такія сустрэчы — адзін з самых яскравых успамінаў ад паездкі ў Беларусь.

А развітальны вечар беларусы і шведы правялі, гуляючы ў боўлінг.

Ключавым мерапрыемствам праекта стала інтэрв'юірванне шведамі палачан. Госці сустрэліся з дэканам інжынерна-будаўнічага факультэта Полацкага дзяржуніверсітэта Аляксандрам Бакатовічам, дырэктарам СШ №16 Ірынай Зімніцкай, журналістам рэдакцыі газеты «Полацкі веснік» Варварай Марозавай, выкладчыкам псіхалогіі ПДУ Святланай Астапчук, а таксама з выпускніком гімназіі Дзмітрыем Шавяковым, які адмыслова для гэтага прыехаў з Дзісны, дзе з'яўляецца святаром. Дарэчы, падчас знаходжання ў Вісбю палачане таксама прымалі ўдзел у такіх інтэрв'ю — яны гутарылі з настаўнікамі, прадстаўнікамі духавенства і іншымі цікавымі шведамі. Назапашаны ў інтэрв'ю матэрыял будзе падсумаваны і прааналізаваны, што дазволіць падрыхтавацца да асноўнага праекта, які распачнецца ў наступным годзе.

Вядома, мы стараемся вызначыць, што яднае нашы народы, пазнаёміцца і наладзіць сяброўскія адносіны, — акрэсліла мэты праекта Алёна Палій, — і, аналізуючы вынікі візіту беларусаў у Швецыю і шведаў у Беларусь, можам сказаць: методыка збору інфармацыі праз інтэрв'ю, якую мы адпрацавалі сёлета, дае выдатныя вынікі. Таму мы ўпэўнены, што ў наступным годзе, калі мы падыдзем да рэалізацыі вялікага праекта, усё атрымаецца на «ўра»!

*Вісбю (шв. Visby) — галоўны горад шведскага вострава Готланд. Сярэднявечны скандынаўскі горад, які выдатна захаваўся, турыстычны цэнтр, помнік Сусветнай спадчыны. Упершыню ўзгадваецца ў летапісных крыніцах у 900 годзе. На плошчы ўсяго 12,08 км2 пражываюць крыху больш за 22 тысяч чалавек.*

**Ігар ПАЛЫНСКІ.**
**Фота з архіва Полацкай дзяржаўнай гімназіі №1 і аўтара.**

**Источник: «Полацкі веснік» (13/11/2013)**